***В. Г. Качан (Мінск)***

# З ГІСТОРЫІ ДАСЛЕДАВАННЯ СІНТАКСІЧНАЙ СЕМАНТЫКІ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ МОВАЗНАЎСТВЕ

Тысячагоддзі развіцця чалавечай свядомасці выпрацавалі сістэму паняццяў аб'ектыўнай рэчаіснасці. Праблема вывучэння паняційных катэгорый – прадмет разважанняў многіх сучасных навук: філасофіі, логікі, этыкі, мовазнаўства, псіхалогіі, біялогіі. Такім чынам, існуюць дзве разнавіднасці катэгорый: адны паняційныя, сэнсавыя катэгорыі, звязаныя са здольнасцю чалавека мысліць, і другія ўласна моўныя катэгорыі, звязаныя з канкрэтнымі моўнымі адзінкамі, праз аналіз якіх яны і выкрываюцца. Уласна моўныя катэгорыі прадстаўлены ў розных мовах свету рознымі моўнымі адзінкамі, формамі: лексічнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі, і ступень развіцця іх на розных моўных узроўнях неаднолькавая. Задача лінгвістычнага даследавання заключаецца ў апісанні сістэмы моўных сродкаў, пры дапамозе якіх мова выражае тыя ці іншыя катэгарыяльныя аспекты гэтых сэнсавых (філасофскіх) паняццяў. Такое апісанне мае на мэце лексічны, марфалагічны і сінтаксічны аналіз канкрэтнага моўнага матэрыялу. Калі лексічны і марфалагічны аспекты больш поўна даследаваны ва ўсходнеславянскім мовазнаўстве, то яго сінтаксічны аспект і сёння патрабуе ўсебаковага і практычнага разгляду.

Актуальнасць напрамку, які атрымаў назву семантычнага сінтаксісу, невыпадковая. Семантычны аспект вывучэння граматычнага ладу мовы заўсёды цікавіў мовазнаўцаў, і трэба адзначыць, што праблема суадносін семантыкі і сінтаксісу ставілася і вырашалася па-рознаму. Нягледзячы на нават крайнія выпадкі вырашэння ўказанай праблемы (напрыклад, сцвярджэнне поўнай незалежнасці сінтаксічных структур ад семантыкі), важнасць семантычных даследаванняў для сінтаксісу мае прынцыповае значэнне. І гэта не дзіўна, таму што галоўная задача апісання мовы – «лінейная арганізацыя семантычнай інфармацыі» [1, 18] – дыктуецца самой прыродай мовы. Паслядоўна і ўсебакова апісаная сінтаксічная семантыка дазваляе стварыць семантычны сінтаксіс.

У сучасным беларускім мовазнаўстве сінтаксіс доўгі час не быў прадметам сістэмнага апісання. Даследаванне сінтаксічных адзінак абмяжоўвалася ўказаннем іх структурных тыпаў, а значэнне ўказвалася па ходу апісання кожнай канкрэтнай сінтаксічнай канструкцыі. Большасць прац беларускіх вучоных прысвечана апісанню структуры снтаксічных адзінак (часцей за ўсё, узроўню простага сказа, апісанню словазлучэнняў). Пытанні ж, звязаныя з семантычным аналізам семантыка-сінтаксічных катэгорый, устанаўленнем іх семантычных разнавіднасцей на аснове выразнага размежавання лексічнай і граматычнай сфер мовы, вызначэннем аб'ектыўных крытэрыяў для іх распазнавання, выяўленнем сістэмы рознаўзроўневых сінтаксічных канструкцый, якія служаць для выражэння кожнай семантыкасінтаксічнай катэгорыі, вывучэннем эксплiцытных і імпліцытных спосабаў выражэння гэтых катэгорый, заставаліся без увагі беларускіх даследчыкаў. Пераарыентацыя сінтаксічных апісанняў з прынцыпу «ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

формы да значэння» на прынцып «ад значэння да формы» стала магчымай, дзякуючы таму, што быў распрацаваны шэраг асноўных палажэнняў (работы С. Д. Кацнельсона, В. А. Звягінцава, В. Г. Гака, Н. Ю. Шведавай, Ю. Д. Апрэсяна, А. У. Бандаркі і інш.). Асноўнай задачай сістэмнага (структурна-паняційнага) апісання стала аб'яднанне апісанняў семантыкі і структуры сінтаксічных адзінак. Пры вывучэнні семантыкі сінтаксічных канструкцый вучоныя не былі адзінадушны нават у азначэнні аб'екта даследавання (што такое сінтаксічная семантыка або семантыка сінтаксічнай канструкцыі) і вызначэнні метаду даследавання. Іменна таму праблема даследавання сэнсавага сінтаксічнага ўзроўню мовы і сёння застаецца адной з самых актыўных і перспектыўных з пазіцый сучаснай лінгвістычнай тэорыі і практыкі. Любое сінтаксічнае апісанне, за рэдкім выключэннем, абавязкова ўключае момант семантычнага аналізу. Семантычны аналіз сінтаксічных адзінак, якія рэалізуюць адзін тып семантыка-сінтаксічных адносін, служыць сэнсавым службовым інвентаром, неабходным для таго, каб распазнаць, выбраць пэўныя сінтаксічныя канструкцыі з ліку тых, якімі валодае мова.

У сувязі с тым, што «паняційныя катэгорыі» адносяцца да прадмета разважанняў многіх гуманітарных навук, даследчыкі вырашаюць пытанні аб суадносінах паняційных (філасофскіх) катэгорый і семантыка-сінтаксічных катэгорый, сінтаксічнай семантыкі і лексікі (работы Р. А. Будагава, А. Я. Міхневіча, А. У. Бандаркі, В. Г. Адмоні, Г. А. Залатавай і інш.). Прадметам сінтаксісу не могуць быць паняцці логікі, паколькі лагічныя паняцці знаходзяцца па-за межамі мовы, а сінтаксічныя значэнні ўнутры мовы. Паняцці логікі, філасофіі толькі ў пэўнай меры дапамагаюць лінгвісту ў даследаванні сінтаксічнай семантыкі, у той меры, у якой сінтаксіс выконвае сваю асноўную функцыю: перадаваць і выражаць думкі і пачуцці людзей сродкамі, якія ў яго ёсць.

Упершыню ў беларускім мовазнаўстве азначэнне сінтаксічнай семантыкі было дадзена А. Я. Міхневічам: «Пад сінтаксічнай семантыкай разумеецца тая частка агульнамоўнай семантыкі, тыя семантычныя катэгорыі, што вызначаюць граматычную (не індывідуальную) спалучальнасць слоў і ўскрываюцца праз аналіз сінтаксічных структур» [1, 16]. Значэнне сінтаксічнай адзінкі – гэта абагульненае моўнае адлюстраванне сувязей і адносін паміж прадметамі і з'явамі аб'ектыўнай рэальнасці. Сінтаксічная семантыка не выводзіцца з суммы лексічных значэнняў слоў, якія ўваходзяць у склад сінтаксічнай канструкцыі. Значэнне ў сінтаксісе выступае ў сваім абагульненым выглядзе (семантыкасінтаксічная катэгорыя), чым ужо адрозніваецца ад значэння ў лексіцы. Аднак, гэта не азначае, што трэба ізаляваць сінтаксічную семантыку ад канкрэтнага лексічнага напаўнення сінтаксічнай канструкцыі, значэнне якой не складаецца з сумы значэнняў лексем, ад лексічнай і граматычнай прыроды яе кампанентаў. Гэта значыць, што семантычная структура сінтаксічных канструкцый і выбар той ці іншай сінтаксічнай формы выражэння звязаны з семантыкай кампанентаў сінтаксічнай канструкцыі і іх падзелам на лексіка-граматычныя класы. Любая семантыка-сінтаксічная катэгорыя валодае сваім наборам лексіка-граматычных класаў слоў.

У сваёй манаграфіі «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы» Арнольд Яфімавіч Міхневіч указаў на неабходнасць выдзялення

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дыферынцыйных семантычных прыкмет для сінтаксічных адзінак, пабудовы сістэмы сінтаксічных значэнняў на аснове бінарных апазіцый, вырашэння праблемы эксплікацыі і імплікацыі ў сінтаксісе і інш. У мове паняційнай катэгорыі адпавядае семантыка-сінтаксічная катэгорыя, а логікапаняційным прыкметам пэўнага паняцця – дыферэнцыйныя семантычныя прыкметы моўных катэгорый. Метадам супастаўлення дыферэнцыяльных семантычных прыкмет семантыка-сінтаксічнай катэгорыі і дыферэнцыяльных семантычных прыкмет канкрэтнай сінтаксічнай канструкцыі можна вызначыць, якое лексіка-граматычнае значэнне выражае гэтая канструкцыя.

Праблемы семантычнага сінтаксісу беларускай мовы, сфармуляваныя аўтарам, наступныя: «семантычная структура слова з пазіцый сінтаксісу, селекцыйныя катэгорыі, якія фарміруюць семантыка-сінтаксічныя класы слоў; спосабы выражэння селекцыйных значэнняў у беларускай мове; характар аналітызму граматычнага ладу; тэхніка эўрыстычнага аналізу граматычных з'яў; межы паміж граматыкай і лексікай (сінтаксісам і семантыкай), а таксама паміж марфалогіяй і сінтаксісам; семантыка-семантычная стратыфікацыя слоўніка як адзін з аспектаў «скрытай» граматыкі; семантыка-сінтаксічныя апазіцыі класаў слоў і пытанне аб сістэмнасці лексікі; унутраная структура семантыка-сінтаксічнага класа слоў; структура значэння слова і ўзроўневая структура выказвання ў залежнасці ад ступені граматычнай абстракцыі; канструкцыйна-сінтаксічная аманімія і шматзначнасць у беларускай мове; суадносіны простых і складаных сінтаксічных структур» [1, 21]. Акрэсленыя праблемы актуальныя для беларускага мовазнаўства і сёння.

Цікавай, на наш погляд, з'яўляецца заўвага вучонага адносна таго, што «аб'екты і прадметы сумежных і ў пэўнай ступені ўзаемаабумоўленых навук знаходзяцца ў дыялектычнай узаемасувязі: тое, што з'яўляецца аб'ектам у адным плане, становіцца прадметам ў іншых адносінах і наадварот» [1, 12]. І далей: «Такім чынам, прадметам сінтаксісу трэба прызнаць усе тыя аспекты, у якіх можа быць прадстаўлены яго аб'ект – працэс і вынікі моўнай намінацыі сітуацый» [1, 14]. Бясспрэчным застаецца той факт, што паняцці аб'ектыўнай рэчаіснасці знаходзяцца ў складаным узаемадзеянні з моўнай семантыкай, і толькі дзякуючы гэтаму ўзаемадзеянню, мова выконвае камунікатыўную функцыю.

Дасягненні лінгвістычнай навукі ў галіне семантычнага сінтаксісу развіваюць і паглыбляюць функцыянальны і камунікатыўны падыходы да мовы. Вельмі актыўна вынікі даследавання сінтаксічнай семантыкі выкарыстоўваюць нашы калегі з Расіі. Функцыянальны, семантыка-сінтаксічны падыход да мовы знаходзіць месца не толькі ў практыцы выкладання ў ВНУ (такая практыка ёсць і ў нас), але і ў методыцы школьнага выкладання. Нашымі расійскімі калегамі распрацавана праграма для старшых класаў (10–11-я класы) «Логико – предметные категории и способы их выражения в языке и речи» (аўтар М. Т. Баранава), у якой дэманструецца сувязь мовы з логікай і філасофіяй, а таксама падрыхтавана серыя новых падручнікаў (аўтар А. Ю. Купалава) для пачатковых класаў (1–4-я класы). Такую задачу вырашаюць і беларускія лінгвісты і метадысты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

***Літаратура***

1. Міхневіч, А. Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. / А. Я. Міхневіч – Мінск : Навука і тэхніка, 1976 г. – 263 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ